**Н. П. Зорка, А. В. Солахаў** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна)

# ВЫВУЧЭННЕ АНТОНІМАЎ – САСТАЎНАЯ ЧАСТКА ЛЕКСІЧНАЙ ПРАЦЫ НАД УСВЕДАМЛЕННЕМ ВУЧНЯМІ СРОДКАЎ ВЫРАЗНАСЦІ МОВЫ

Лексічныя адзінкі беларускай мовы існуюць не ізалявана адна ад другой, а звязаны паміж сабой разнастайнымі адносінамі – словаўтваральнымі, сінанімічнымі, аманімічнымі, антанімічнымі і інш. Сэнсавыя сувязі паміж словамі найбольш ярка праяўляюцца ў сувязях (асацыяцыях) паводле кантрасту. Супрацьпастаўляюцца дзеянні (*уваходзіць – выходзіць, лаяць – хваліць, радавацца – сумаваць*), якасці (*вясёлы – сумны, густы – рэдкі, цвёрды – мяккі*), прадметныя паняцці з розным значэннем (*вайна – мір, дзень – ноч, зямля – неба, канец – пачатак*) і інш. «У гэтым, – слушна падкрэсліваў Л. А. Новікаў, – праяўляецца прыродная схільнасць розуму чалавека» [1, 6]. Словы вядомага лінгвіста пацвярджаюцца эксперыментальна: школьнікі ў якасці рэакцый на словы-стымулы часцей за ўсё выкарыстоўваюць словы з супрацьлеглым значэннем, г. зн. антонімы [2, 236]. Значыць, у свядомасці дзяцей многія словы жывуць парамі, аб’яднаўшыся паводле кантрасту сваіх значэнняў.

Таму вывучэнне антонімаў малодшымі школьнікамі на ўроках беларускай мовы з’яўляецца вельмі важнай састаўной часткай лексічнай працы, якая будзе садзейнічаць развіццю маўлення дзяцей, а таксама ўсведамленню імі антонімаў як сродкаў выразнасці мовы. Акрамя таго, такая праца паспрыяе развіццю мыслення малодшых школьнікаў, фарміраванню ў іх прыёмаў параўнання, адрознення і супрацьпастаўлення, аналізу і сінтэзу [3, 17].

У працы з вучнямі пажадана выкарыстаць загадкі, адгадкамі якіх з’яўляюцца словы з супрацьлеглым значэннем. Напрыклад, вучням можна прапанаваць загадкі Міхася Пазнякова:

*Адзін і сее, і будуе,*
*Гатуе, возіць, рамантуе.*
*Працуе рупна, без прынукі*
*І мае залатыя рукі.*
*Другі – няўмелы і няўдалы,*
*І абыякавы і вялы.*
*Яго не радуе работа,*
*Бо ім валодае лянота.*
***(Працаўнік – гультай.)***

*Без яго жыццё – самота,*
*Ён – надзея і пяшчота,*
*І памочнік ён, і брат.*
*Хай у нас іх будзе шмат.*
*А ягоны антыпод*
*Прынясе нам шмат нягод.*
*Будзем моцна сябраваць,*
*Каб яго не сустракаць.*
***(Сябар – вораг.)***

Мысленне вучняў пачатковых класаў наглядна-вобразнае. Пры вывучэнні антонімаў настаўніку неабходна абапірацца на нагляднасць, паколькі, параўноўваючы адзін прадмет (малюнак) з другім, вучні падбяруць подпісы да іх: *вялікі – малы, белы – чорны, левы – правы* (малюнак 1); *вясёлая – сумная, светлая – цёмная, смяецца – плача* (малюнак 2). Гэтаму будуць садзейнічаць наступныя пытанні: Якія паводле памеру кругі на малюнку? Якія яны паводле колеру? Якія кругі паводле размяшчэння адзін да аднаго? (Малюнак 1.) Якія паводле настрою дзяўчынкі на малюнку? Якія яны паводле колеру валасоў? Што робіць кожная з іх? (Малюнак 2). Апошні малюнак можна выкарыстаць і пры падрыхтоўцы да сачынення, прысвечанага апісанню чалавека.



Малюнак 1



Малюнак 2

Падбор антонімаў – адзін са сціслых, але дакладных на аснове супрацьлеглых значэнняў прыёмаў тлумачэння незнаёмых слоў. Формай такой працы можа стаць запаўненне крыжаванкі (малюнак 3). Настаўнік прапануе вучням да слоў, змешчаных злева ад рамкі, падабраць словы з супрацьлеглым значэннем і ўпісаць іх у клеткі справа. Калі заданне будзе выканана правільна, то ў сярэднім, вертыкальным, слупку можна прачытаць назву гэтых слоў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Фініш | | | | | |
| Пачатак | | | | | |
| Зімой | | | | | |
| Мала | | | | | |
| Позні | | | | | |
| Зверху | | | | | |
| Летні | | | | | |
| Прамы | | | | | |

Малюнак 3

У пустыя клеткі вучні ўпішуць словы *старт, канец, летам, многа, ранні, знізу, зімні, крывы* і ў сярэднім вертыкальным радку прачытаюць агульную назву гэтых слоў – *антонімы*.

– Дык якія словы мы будзем называць антонімамі? – падводзячы вынік працы вучняў, запытае ў іх настаўнік.

Такім чынам, спецыяльна не завучваючы, дзеці знаёмяцца з тэрмінам *антонімы* і яго азначэннем.

Праца над антонімамі дапамагае дзецям больш глыбока і дакладна зразумець значэнне слова, усвядоміць розныя значэнні шматзначнага слова. Напрыклад, слова *свежы* мае розныя значэнні. Калі вучань падбірае да словазлучэння *свежы боршч* словазлучэнне з процілеглым значэннем (*кіслы боршч*), ён засвойвае значэнне «свежы – кіслы».

Каб зразумець, што да аднаго слова могуць быць падабраны розныя антонімы, настаўнік можа выкарыстаць наступнае практыкаванне.

**Да словазлучэнняў з адным і тым жа прыметнікам падбярыце супрацьлеглыя паводле значэння:**

*свежы* — *боршч (кіслы боршч)*, *часопіс (стары часопіс)*

*старая* — *хата (новая хата)*, *бяроза (маладая бяроза)*

Выконваючы практыкаванне, вучні асэнсоўваюць, што, каб падабраць да слова антонім, трэба падумаць, якое паняцце будзе процілеглым паводле значэння дадзенаму, і выразна ўявіць значэнне гэтага слова. Такое практыкаванне развівае дакладнасць мовы, паглыбляе разуменне значэння слоў.

Багатыя магчымасці для працы з вучнямі даюць прыказкі, якія будуюцца на аснове антонімаў.

1. Знайдзіце словы з супрацьлеглым значэннем ў наступных прыказках: *Новых сяброў набывай, а старых не забывай. Ранняя птушка дзюбу выцірае, а позняя – толькі вочкі праціраe.*

2. Высветліце, ці мае сэнс дадзеная прыказка, здагадайцеся, што не так у ёй, і выпраўце яе.

*Згода руйнуе, а нязгода будуе.* (*Згода будуе, а нязгода руйнуе.*)

3. Успомніць прыказкі, у склад якіх уваходзяць наступныя антонімы: *добрае – дрэннае, блізка – далёка, горкая – салодкі.* (*Добрае далёка чуваць, а дрэннае яшчэ далей. Блізка відаць, ды далёка дыбаць. Горкая часам праца, ды хлеб ад яе салодкі.*)

Для фарміравання у вучняў ўменняў знаходзіць і вылучаць з тэксту словы з супрацьлеглым значэннем, падбіраць да слоў антонімы, складаць сказы з імі можна выкарыстаць наступныя практыкаванні:

1. Параўнайце два прадметы па адной прыкмеце. Запішыце сказы, устаўляючы ў іх патрэбныя па сэнсе словы.

Па велічыні. *Бусел (які?) . . . (вялікі), а верабей (які?) . . .* (*маленькі*).
Па колеру. *Вугаль (які?) . . . (чорны), а снег (які?) . . .* (*белы*).
Па смаку. *Перац (які?) . . . (горкі), а цукерка (якая?) . . .* (*салодкая*).

Пасля выканання практыкавання вучням даецца дадатковае заданне: у кожным сказе падкрэсліце словы, якія абазначаюць супрацьлеглыя прыкметы прадметаў. Прывядзіце свае прыклады такіх слоў.

Вучні засвойваюць, што сярод слоў, якія абазначаюць прыкметы прадметаў, ёсць супрацьлеглыя па сэнсу.

2. Складзіце сказы, выкарыстоўваючы словы з супрацьлеглым значэннем: *цёмны – светлы, смелы – баязлівы.* (*Цёмная ноч мінае, пачынаецца светлая раніца. Смелага чалавека паважаюць, а баязлівага – не.*)

3. Прачытайце тэкст. Выдзеленыя словы замяніце на словы з супрацьлеглым значэннем. Які тэкст атрымаецца?

***Перад** навальніцай*

*Неба **пацямнела. Цяжкія** хмары плывуць над зямлёй. У твар дзьме **халодны** вецер. Чуюцца **моцныя** раскаты грому.*

Прачытаўшы тэкст, у сшытку вучні запісваюць яго зменены варыянт:

МГПУ им. И.П. Шамякина

***Пасля** навальніцы*

*Неба **пасвятлела. Лёгкія** хмары плывуць над зямлёй. У твар дзьме **цёплы** вецер. Чуюцца **слабыя** раскаты грому.*

Пасля можна правесці гутарку па наступных пытаннях:

*– Якія змены адбыліся ў прыродзе пасля навальніцы?*

*– З дапамогай якіх слоў гэта перадаецца?*

*– Выпішыце прыметнікі, супрацьлеглыя па сэнсе, разам з назоўнікамі.*

4. А.Э. Сіманоўскі прапаноўвае практыкаванне «*Назаві адрозненні*» [4, 73]. Для яго выканання на дошцы запісваюцца або вывешваюцца малюнкі рэчаў, напрыклад: шафа, электрачайнік, аўтамашына, сшытак.

– Якімі асаблівасцямі адрозніваюцца шафа і электрачайнік; аўтамашына і сшытак?

*а) Шафа – вялікая, выкарыстоўваецца для захоўвання рэчаў, не патрэбна электрычнасць.*

*Электрачайнік – маленькі, не выкарыстоўваецца для захоўвання рэчаў, патрэбна электрычнасць.*

*б) Аўтамашына – вялікая, зроблена з металу, здольная рухацца.*

*Сшытак – маленькі, зроблены з паперы, не здольны рухацца.*

Такія практыкаванням вучаць малодшых школьнікаў кіраваць сваім мысленнем: ставіць даследчыя мэты, вылучаць гіпотэзы, разглядаць вядомыя ім факты з пазіцый вылучаных гіпотэз. Гэтыя здольнасці з'яўляюцца асноўнымі перадумовамі творчасці.

5. Знайсці нешта добрае ў такіх, на першы погляд, непрыемных сітуацыях:

*– Настаўнік на ўроку паставіў двойку.*

*– Бацькі не дазволілі ісці гуляць.*

*– Разбіў (разбіла) дарагую вазу.*

Практыкаванне садзейнічае развіццю творчага мыслення малодшых школьнікаў.

Практыкаванні з антонімамі павінны ўключаць і граматыка-арфаграфічны матэрыял. Можна прапанаваць дзецям пары аднакаранёвых слоў-антонімаў, размешчаных у беспарадку. Патрабуецца суаднесці іх так, каб яны сталі побач, а пасля параўнаць паводле сэнсу і саставу.

| | |
|---|---|
| *адамкнуць* | *перабегчы* |
| *падысці* | *сысці* |
| *увайсці* | *высыпаць* |
| *насыпаць* | *замкнуць* |
| *узысці* | *выйсці* |
| *недабегчы* | *адысці* |

– Якая частка ў гэтых дзеясловах робіць іх процілеглымі паводле значэння. Выдзеліце яе.

В. Г. Пархоменка адзначае, што вельмі карыснымі з'яўляюцца практыкаванні, якія аб'ядноўваюць працу над сінонімамі і антонімамі. Гэта могуць быць практыкаванні на размежаванне дадзеных паняццяў (спачатку сінонімы, потым антонімы) або на выкарыстанне антонімаў, на ўдакладненне або праверку разумення дзецьмі значэння антонімаў. Апошнія заданні найбольш эфектыўныя: яны развіваюць дакладнасць разумення значэння слоў, іх ужывання. Напрыклад, даюцца сказы: *«У пачатку восені раніцы **халаднаватыя**, а ў лістападзе зусім **халодныя»***. Падабраўшы антонімы да выдзеленых слоў (*цёплыя* і *гарачыя*), дзеці ўдакладняюць сваё разуменне іх значэнняў [3, 19].

Засваенню антонімаў вучнямі пачатковых класах будуць садзейнічаць заданні з элементамі гульні:

1. Замест шматкроп'яў устаўце словы, супрацьлеглыя паводле значэння папярэднім. Хто хутчэй збярэ ўвесь ланцужок, той і пераможа.

*Добры дзень – … халодная – ... лета – ... ранняя – ...восень – ... сухая – ... зямля – ... хмурае – ... раніца – ... ціхі – ... горад.*

(*Добры дзень – ноч халодная – гарачае лета – зіма ранняя – позняя восень – вясна сухая – вільготная (сырая) зямля – неба хмурае – светлая раніца – вечар ціхі – шумны горад.*)

2. Прадоўжыце ланцужок так, каб кожнае наступнае слова было супрацьлеглым паводле значэння папярэдняму: *добры сябар – вораг наступае – адступае холад* – … У каго ланцужок атрымаецца даўжэйшы?

3. Калі да назвы якога-небудзь прадмета дадаць прыстаўку *анты-*, то слова ператворыцца ў цудадзейнае. Напрыклад:

*Ручка – антыручка.*

*Калі разглядаць асноўную функцыю ручкі – пісаць, то антыручка – гэта нешта такое, што выконвае адваротную функцыю.*

*– Як выкарыстоўваць такую ручку?*

*– Дзе яе можна прымяняць?*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Практыкаванне заснавана на супярэчнасці паміж вядомым словам і невядомым (аказіянальная антанімічная пара). Гэта і стварае праблемную сітуацыю, якую трэба вырашыць, што стымулюе маўленчую свабоду дзіцяці, вучыць яго даследаваць магчымасці слоў, развівае мысленне, уяўленне, яго творчы патэнцыял.

У цэлым праца над антонімамі спрыяе развіццю маўлення і мыслення малодшых школьнікаў, робіць маўленне вучняў больш выразным і дакладным, сціслым і даходлівым. Вывучэнне антонімаў з выкарыстаннем практыкаванняў рознага тыпу і на розных этапах навучання мове выпрацоўвае ў вучняў, з аднаго боку, свядомыя адносіны да выбару і ўжывання антонімаў як сродкаў выразнасці мовы, з другога – навыкі выкарыстання рознага тыпу антанімічнай сувязі сказаў у тэксце.

**Літаратура**

1. Новиков, Л. А. Антонимия и словари антонимов / Л. А. Новиков // Словарь антонимов русского языка: около 2 000 антонимических пар / М. Р. Львов; под ред. Л. А. Новикова. – М., 1978. – С. 5–27.

2. Вага, Т. У. Антанімія як аснова сэнсавых сувязей (асацыяцый) / Т.У. Вага // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў: зб. навук. артыкулаў / адк. рэд. А.В. Солахаў, В. В. Шур. – Мазыр, 2006. – С. 236–237.

3. Пархоменко, Г. В. Развитие речи младших школьников в процесе овладения изобразительными средствами языка художественных произведений / Г.В. Пархоменко; Ленинград. гос. пед. ин-т им. А. И. Герцена. – Ленинград, 1976. – 68 с.

4 Симановский, А.Э. Развитие творческого мышления детей / А.Э. Симановский. – Ярославль, 1996. – 158 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина